

# Выкарыстанне вопыту нефармальнай адукацыі
## як умова павышэння якасці дадатковай адукацыі педагагічных кадраў


### Мікалай Запрудскі

**Мікалай Іванавіч Запрудскі** — кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры педагогікі і філасофіі адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.


Законам "Аб адукацыі" ўстановы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўпраўленчых кадраў і спецыялістаў сферы адукацыі аднесены да сістэмы дадатковай адукацыі. У краіне працуюць Акадэмія паслядыпломнай адукацыі (АПА), Мінскі гарадскі і абласныя інстытуты развіцця адукацыі (ІРА). За шэсць дзесяцігоддзяў у гэтых установах сфармавалася практыка работы, якая адлюстроўвае, з аднаго боку, вопыт і традыцыі, а з другога боку, яна рэгулюецца адпаведнай нарматыўна-прававой базай. Сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі (СПК) выконвае наступныя функцыі:

- **кампенсаторную,** якая скіравана на ліквідацыю прабелаў у базавай (прафесійнай) адукацыі спецыяліста;
- **адаптыўную** — аператыўную падрыхтоўку і перападрыхтоўку работнікаў да ўмоў дзейнасці, якія перманентна змяняюцца;
- **развіццёвую,** накіраваную на забеспячэнне развіцця агульнакультурнага кругозору, узбагачэнне навуковымі ведамі, развіццё творчага патэнцыялу і задавальненне шматлікіх пазнавальных інтарэсаў і духоўных патрэб асобы; на развіццё адукацыі і грамадства ў цэлым;
- **інфармацыйную,** прызначэнне якой — узбраенне слухачоў актуальнай інфармацыяй;
- **экспертную,** адказную за экспертызу інавацыйных праектаў.

Разам з вялікімі дасягненнямі, у дзейнасці устаноў СПК маюцца супярэчнасці паміж:

- шматлікімі адукацыйнымі запытамі слухачоў курсаў і немагчымасцю іх цалкам задаволіць пад час кароткатэрміновых курсаў;
- жаданнямі слухачоў практычных відаў дзейнасці і перавагай лекцыйных заняткаў;
- важнасцю падрыхтоўкі слухачоў да інавацыйнай дзейнасці, якая забяспечвае развіццё адукацыйнай практыкі і псіхалагічнымі і прафесійнымі стэрэатыпамі педагогаў;
- патрэбамі ў аптымальным забеспячэнні заняткаў дыдактычнымі сродкамі і перавагай вербальных сродкаў навучання;
- дынамікай лібералізацыі эканомікі, пранікненнем рынкавых працэсаў у адукацыю і перавагай адміністратыўных механізмаў функцыянавання сістэмы павышэння кваліфікацыі і г.д.

У пэўнай ступені пераадоленню гэтых супярэчнасцей і вырашэнню адпаведных праблем спрыяе перайманне ідэй, падыходаў і метадаў работы з сістэмы нефармальнай адукацыі. (Каб быць справядлівым, трэба заўважыць, што ў ёй ёсць і свае праблемы).

Спецыфіка сістэмы нефармальнай адукацыі (НФА) заключаецца ў наступным:

- адсутнічае яе заканадаўчае афармленне;
- адсутнічаюць нарматыўныя патрабаванні па стварэнні адукацыйнага асяроддзя гэтай сістэмы (стандарты, вучэбныя планы і інш.). Больш дакладна, стандарты ёсць, але іх ніхто не зацвярджае, людзі і арганізацыі самі ствараюць для сваіх заняткаў адпаведныя стандарты, самі іх змяняюць (1);
- рознаўзроставы састаў суб'ектаў навучання, розная (або аднолькавая) прыналежнасць да прафесійнай сферы, узроставыя асаблівасці навучэнцаў (у асноўным, дарослыя, якія маюць прафесію, сацыяльны досвед, сацыяльная спеласць, тып сацыяльных паводзін;
- дзякуючы гнуткай сістэме, якая дазваляе выкарыстоўваць розныя шматлікія формы, метады навучання суб'ектаў, забяспечваецца рэалізацыя індывідуальных адукацыйных патрэб суб'ектаў.

Сапраўды, у адукацыйным працэсе НФА выкарыстоўваецца вельмі шырокі спектр форм навучання: курсы, трэнінгі, семінары, мадэрацыйныя семінары, карпаратыўнае навучанне, каманднае ўзаемадзеянне і г.д., якія дазваляюць задавальняць адукацыйныя запыты суб'ектаў. Прымяняюцца актыўныя метады навучання.

**Нефармальная адукацыя — гэта розныя гнуткія па арганізацыі і формах адукацыйныя сістэмы, якія зарыентаваныя на канкрэтныя патрэбы і інтарэсы навучэнцаў.** Для гэтых сістэм характэрныя пэўныя прыкметы арганізаванасці, дапаўняльнасці ведаў, што атрымліваюць педагогі, да тых ведаў, што спецыялісты ўжо маюць. Пры завяршэнні заняткаў у сістэме НФА не ўзнікаюць якія-небудзь прававыя наступствы. Па сутнасці, НФА з'яўляецца важным складнікам неперарыўнай адукацыі — **навучанне праз усё жыццё** (lifelong learning).

Развіццё ідэі неперарыўнай адукацыі адпавядае гуманістычнай парадыгме, згодна з якой у цэнтры ўвагі знаходзіцца чалавек, асоба, яе жаданні, здольнасці, яе рознабаковае развіццё. Хуткае і дынамічнае развіццё вытворчай і сацыяльнай сфер стымулявала навукоўцаў да стварэння і апрабацыі тэарэтычных мадэляў неперараўнай адукацыі, фармавання вопыту іх практычнай рэалізацыі. Мэта неперараўнай адукацыі — дапамога людзям "прыстасавацца" да прафесійнай дзейнасці, а таксама спрыянне паспяховай адаптацыі чалавека да новых форм жыцця, паляпшэння яго якасці.

→

Еўрапейскі саміт (Лісабон, 2000 год) стаў важнай вехай у вызначэнні палітыкі і практыкі адукацыі ў Еўрапейскім Саюзе. Яго высновы пацвярджаюць, што Еўропа ўжо ўступіла ў “эпоху ведаў”. На саміце быў прыняты праграмны дакумент “Мемарандум неперерарыўнай адукацыі Еўрапейскага Саюза” (2). У гэтым дакуменце адзначаецца, што стратэгія неперарыўнай адукацыі павінна трымацца на **супрацоўніцтве ўладаў і грамадскіх арганізацый, так званых “сацыяльных партнёраў”,** паколькі менавіта яны бліжэй за ўсіх звязаныя з інтарэсамі і патрэбамі асобных грамадзян і супольнасцей. Апошнія праграмы ЕС у галіне адукацыі і моладзевай палітыкі скіраваныя на развіццё сацыяльнага партнёрства, як на мясцовым, так і на транснацыянальным узроўнях. Акрамя гэтага, павінна ўзмацняцца **сувязь паміж установамі фармальнай і нефармальнай адукацыі.**

У Мемарандуме названы тры віды адукацыйнай дзейнасці:

- **фармальная адукацыя.** Яна завяршаецца выдачай агульнапрызнанага дыплома або атэстата;
- **нефармальная адукацыя,** якая звычайна не прадугледжвае выдачу дакумента. Яна адбываецца ў адукацыйных установах, грамадскіх арганізацыях, клубах, гуртках, а таксама пад час індывідуальных заняткаў з рэпетытарам або трэнерам;
- **інфармальная адукацыя** — гэта індвідуальная пазнавальная дзейнасць, якая суправаджае паўсядзённае жыццё; яна не абавязкова носіць мэтанакіраваны характар.

У гэтым дакуменце вызначаны і раскрыты наступныя прынцыпы арганізацыі неперарыўнай адукацыі, якія адносяцца да ўсях відаў адукацыйнай дзейнасці:

**1. Новыя базавыя веды і навыкі для ўсіх.** Тут маецца на ўвазе забеспячэнне гарантый усеагульнага бесперапыннага доступу да адукацыі з мэтай атрымання і абнаўлення навыкаў, неабходных для ўключэння ў інфармацыйнае грамадства.

**2. Павелічэнне інвестыцый у чалавечыя рэсурсы.** Гэта дазваляе падняць прыярытэт самай важнай каштоўнасці Еўропы — яе людзей.

**3. Інавацыйныя методыкі выкладання і вучэння,** якія забяспечваюць прымяненне адукацыйных тэхналогій, што ўсё болей зарыентаваныя на карыстальніка. Пры гэтым вучань перастае быць пасіўным рэцыпіентам інфармацыі, улічваецца прыярытэт асобаснай матывацыі, крытычнага мыслення і ўмення вучыцца. Педагогі становяцца ва ўсё большай ступені кансультантамі, фасілітатарамі.

**4. Новая сістэма ацэнкі атрыманай адукацыі.** Яна павінна адлюстроўваць ўсе веды, уменні і навыкі і ўвесь атрыманы чалавекам вопыт і павінна быць агульнапрызнанай у еўрапейскім кантэксце. Такая сістэма магла б поўнасцю раскрыць увесь патэнцыял чалавека, аб якім нават ён сам можа не здагадвацца. Пры гэтым узрастае роля самога вучня як ацэншчыка асабістага адукацыйнага прасоўвання.

**5. Развіццё педагагічнай падтрымкі і кансультавання.** Прынцып патрабуе стварэць магчымасці на працягу ўсяго жыцця забяспечыць кожнаму свабодны доступ да інфармацыі аб адукацыйных магчымасцях у Еўропе і да неабходных кансультацый і рэкамендацый; стварэнне службаў, рэсурсных цэнтраў, якія маглі б даць рэкамендацыі ў галіне адукацыйнага прафесійнага і асобаснага развіцця і былі б зарыентаваныя на інтарэсы і патрэбы актыўнага карыстальніка.

**6. Набліжэнне адукацыі да месца жыхарства** — адукацыйныя магчымасці побач з месцам пражывання. Гэта дасягаецца дзякуючы сетцы вучэбных і кансультацыйных пунктаў і дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям.

Такім чынам, нефармальная адукацыя — падсістэма неперарыўнай адукацыі; прынцыпы яе арганізацыі павінны працаваць як у фармальнай (сістэме дадатковай адукацыі кадраў адукацыі), так і ў нефармальнай адукацыі.

Сёння ўжо праяўляюць сябе тэндэнцыі “пранікнення” ў сістэму паслядыпломнай адукацыі настаўнікаў, метадыстаў і кіраўнікоў школ элементаў нефармальнай адукацыі. Напрыклад, у НФА ўжо даўно працуюць рэсурсныя цэнтры, якія прадстаўляюць людзям актуальную інфармацыю, кансультацыі. Апошнім часам такія цэнтры становяцца звыклым атрыбутам адукацыйнай сістэмы г. Мінска: на базе многіх агульнаадукацыйных устаноў працуюць рэсурсныя цэнтры, якія робяць свой унёсак у павышэнне кваліфікацыі педагогаў. Другі прыклад: на рэалізацыю адукацыйных праектаў агульнаадукацыйныя ўстановы таксама (як і арганізацыі нефармальнай адукацыі) атрымліваюць гранты ад спонсараў. Усё шырэй прымяняюцца актыўныя метады навучання дарослых (3). Аўтарскія курсы ў АПА і ІРА ў значнай ступені нагадваюць трэнінгі, якія праводзяцца на семінарах НФА, на якіх выкладчык выконвае ролю трэнера.

Разам з тым, існуюць і іншыя магчымасці для трансляцыі ва ўстановы СПК досведу НФА. Яны тычацца розных аспектаў адукацыйнага працэсу: зместавага, тэхналагічнага, арганізацыйнага. Як паказвае пакуль што лакальны досвед рэалізацыі гэтых магчымасцей у навучанні слухачоў курсаў, мэтазгодна прыняць і развіваць наступныя ідэі.

**Зместавы аспект:**

- курсы павышэння кваліфікацыі не павінны замыкацца на вузкапрафесійныя праблемы; яны павінны быць змястоўна звязаны з больш шырокім кантэкстам: сацыяльнымі праблемамі, якія актуальныя для Еўропы, краіны, мясцовых супольнасцей, саміх настаўнікаў;
- вялікае значэнне павенен мець кампетэнтнасны падыход, які фармуе суб’ектаў уласнай стваральнай дзейнасці;
- на курсах у настаўніка павінна быць магчымасць (можа быць, факультатыўна) авалодаць элементамі якога-небудзь рамяства (тым больш, гэта актуальна ў сувязі з вялікім значэннем школьных прафарыентацыйных факультатыўных заняткаў; факультатывы не толькі пад вучэбныя прадметы, але і пад прафесіі);
- важна больш хутка і гнутка мяняць змест навучання ў сувязі з трансфармацыямі і праблемамі ў соцыуме.

**Тэхналагічны аспект:**

- шырэй прымяняць актыўныя метады навучання, якія дазваляюць кожнаму ўдзельніку курсаў асэнсаваць сваю місію, сваю прфесійную дзейнасць і сацыяльную ролю, вучыцца крытычнаму мысленню, бачыць

супярэчнасці, прымаць рашэнні, вызначаць новыя нормы дзейнасці, праектаваць больш эфектыўныя мадэлі адукацыйнага працэсу, ажыццяўляць зместавую адваротную сувязь;

- ажыццяўляць цыкл навучання на падставе ўласнага вопыту слухачоў;
- вучэбныя заняткі абсталёўваць не толькі наглядными, але і “дзейнаснымі” сродкамі навучання;
- педагагічная пазіцыя выкладчыка павінна быць наступнай: ён павінен быць “дызайнерам” адукацыйнага асяроддзя, кіраваца дэмакратычнымі прынцыпамі ў працы з вучэбнай групай, рэалізоўваць мадэль шматбаковай камунікацыі, будаваць працэс на прынцыпах супрацоўніцтва, заахвочваць актыўнасць слухачоў, абапірацца на іх суб’ектны вопыт, ажыццяўляць зваротную сувязь (4).

**Арганізацыйны аспект:**

- інфармаваць патэнцыяльную мэтавую аўдыторыю аб курсах, якія плануюцца;
- назіраць навучанне да спажыўцоў адукацыйных паслугаў;
- групы слухачоў фармаваць на падставе іх самавызначэння на навучанне менавіта на дадзеных курсах;
- рыхтаваць мультыплікатараў, якія будуць потым навучаць іншых;
- спалучаць навучанне з актыўным адпачынкам слухачоў.

Адзначым, што пералічаныя ідэі ўжо ў той або іншай ступені праяўляюць сябе пры арганізацыі і правядзенні курсаў у СПК. Разам з тым, іх больш шырокае ўкараненне не заўсёды магчыма з-за жорсткай рэгламентацыі фармальнай паслядыпломнай адукацыі.

## Літаратура:

1. Мацкевич В. и др. Подходы к стандартам и стандартизации в неформальном образовании // Адукатар, 2006. №3 (9).
2. Мемарандум непарарыўнай адукацыі Еўрапейскага Саюза. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.znanie.org/docs/memorandum.htm / 20 студзеня 2009 года.
3. Жук А.И., Кошель Н.Н. Активные методы обучения в системе повышения квалификации педагогов. Мн., 2006.
4. Инновационные методы обучения в гражданском образовании / Величко В.В., Карпиевич Д.В., Карпиевич Е.Ф., Кирилюк Л.Г. Мн., 1999.

■

## кніжная палічка

**Свобода ассоциаций: сборник документов / сост. Е. Тонкачева, Г. Черепок, Т. Рудкова — Минск: ФУАинформ 2009. — 368 с.**




Сборник “Свобода ассоциаций” — новое издание основных международных договоров, документов Совета Европы, ОБСЕ. В отдельном разделе представлены неофициальные переводы избранных решений Европейского Суда по правам человека и соображений Комитета по правам человека Организации Объединенных Наций. Данное пособие является первым из запланированной серии хрестоматийных материалов, планируемой специалистами Центра правовой трансформации и Фонда развития правовых технологий к изданию в ближайшие годы. Хрестоматия была задумана как удобный, достаточно полный и компактный путеводитель по вопросам свободы ассоциаций.

Серия хрестоматийных материалов не случайно открывается именно с вопросов свободы ассоциаций. Составители сборника уже почти 15 лет работают с общественными организациями, стараясь быть для них доступным правовым ресурсом и поддержкой в их общественно–полезной деятельности. Все эти годы они остаются убежденными сторонниками того, что право должно являться инструментом защиты свободного развития гражданского общества, гарантией для многих очень разных объединений и инициатив от вмешательства в их индивидуальность, способом определения правил взаимодействия гражданского общества и государства.

Партнерские отношения с международными институтами, организациями и экспертами по всему миру, теми, чей интерес сосредоточен на идеях продвижения прав человека и свободы личности, теми, кто неустанно направляет свою деятельность на развитие в национальных практиках принципов и норм, закрепленных Всеобщей декларацией прав человека, Европейской Конвенцией о защите прав человека и основных свобод, и постоянный обмен опытом позволяет авторам проследить тенденции развития законодательства и правоприменительной практики в разных странах. Национальные практики существенно отличаются друг от друга по многим аспектам, которые принято выделять в качестве индикаторов при оценке правового климата свободы ассоциаций. Одни страны законодательно снижают административные барьеры, способствуя развитию гражданской активности, другие через систему чрезмерных запретов и ограничений демонстрируют настороженное отношение к любым формам самостоятельного объединения.

Хрестоматия направлена на популяризацию правового понимания свободы ассоциаций. Она предназначена в первую очередь студентам, аспирантам, преподавателям правовых и политологических дисциплин, представителям общественных организаций и инициатив, а также всем тем, чья профессиональная деятельность соприкасается с таким сложным и достаточно новым для постсоветского сознания явлением, как право граждан объединяться для достижения общих целей. Приобрести книгу можно, обратившись в просветительское учреждение “Центр правовой трансформации”.